УДК 9(476)

# Праблемы беларускай дзяржаўнасці ў сярэднявеччы

Арбузаў А.Ц.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Гісторыя, у тым ліку гісторыя найноўшая, не мае ўмоўнага ладу і мала чаму вучыць. Няважная яна настаўніца. Але гэта не азначае, што мы маем права ігнараваць яе ўрокі. Асабліва, калі гэтыя ўрокі маюць самае непасрэднае дачыненне да лёсу нашай краіны, калі яны самым непасрэдным чынам асацыіруюцца са злобаю дня, з пытаннямі "Як быць? Што рабіць?". У свой час яшчэ Васіль Осіпавіч Ключэўскі пісаў: "Наша справа сказаць праўду, не турбуясь аб тым, што скажа які-небудзь ..." дзяржаўны дзеяч. Далей ён сцвяржае: "Прадмет гісторыі – тое ў мінулым, што не праходзіць, як спадчына, урок, незакончаны працэс, як вечны закон".

Гістарычны лёс Беларусі складаўся такім чынам, што ёй на працягу многіх стагоддзяў прыходзілася зведаць як перыяды сапраўднай магутнасці, росквіту, своеасаблівыя "зорныя часіны" беларускай дзяржаўнасці і культуры, так і працяглыя перыяды ўсеагульнага заняпаду, штучнага падаўлення нацыянальнай самабытнасці беларусаў, адмаўлення ад іх багатай культурна-духоўнай спадчыны. Аднак і ў самых неспрыяльных перыядах развіцця беларускі народ ніколі поўнасцю не страчваў свайго нацыянальнага аблічча, каб пазней, у лепшых абставінах, выявіць іх найбольш яскрава ў розных галінах жыццядзейнасці грамадства.

У адукацыйным стандарце па падрыхтоўцы кадраў інжынерных спецыяльнасцей важнае месца адводзіцца праблемам нацыянальна-дзяржаўнага станаўлення Беларусі. Сёння мы смела можам сказаць, што пытанні нацыянальнай кансалідацыі беларусаў выходзяць на першы план мнагавекавой гісторыі Беларусі. Без пазнання грунтоўных , навуковых высноў з'яўлення чалавека і засялення ім беларускай зямлі немагчыма засвоіць умовы ўзнікнення грамадства і палітыкі, устойлівых аб'яднанняў людзей у выглядзе дзяржаўных утварэнняў.

Як вядома, жыццё на Зямлі існуе 3,6 млн. гадоў. Прыкладна 2 млн. год таму назад чалавек выдзеліўся з жывёльнага свету.

Калі гісторыя чалавецтва налічвае мільёны гадоў, то дзяржава – гэта параўнальна нядаўняе вынаходніцтва людзей. Яе ўзрост складае ўсяго 5 тысяч год – 3 тысячы да нашай і 2 тысячы год нашай эры. Спачатку гэта былі слабыя, прымітыўныя, дрэнна арганізаваныя сістэмы. Аднак гэтыя працейшыя формы дзяржаўнасці стварылі падмурак для ўзнікнення магутных феадальных дзяржаў усходнееўрапейскіх насельнікаў Полацкага, Тураўскага, Наўгародскага, Кіеўскага канястваў, а пазней – Вялікага княства Літоўскага і Маскоўскага княства.

Агульнавядома, што першапачатковы перыяд утварэння дзяржаў ва ўсходніх славян, у тым ліку і засяліўшых тэрыторыю Беларусі, паказаны ў захаваўшыхся крыніцах да нашага часу, недастаткова. Гэта тлумачыцца тым, што найбольш старажытныя летапісы былі знішчаны ці знаходзяцца ў таямніцах, напрыклад, у бібліятэцы Івана Жахлівага. Недастаткова адлюстраваны гэты перыяд яшчэ таму, што пісьменнасць стала распаўсюджвацца праз 3-4 стагоддзі пасля ўтварэння дзяржаў.

Ёсць звесткі, што дзяржаўныя ўтварэнні ў нашых продкаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі існавалі яшчэ ў V стагоддзі з прыходам сюды крывічоў. У летапісах і іншых пісьмовых крыніцах гэтыя ўтварэнні мелі такія назвы як «зямля», «воласць», «горад», «княства» і інш. У склад зямлі ўваходзіла некалькі такіх дробных адзінак і яны выступалі як аб’яднаная феадальная дзяржава. Назву “зямля” насіла ранней Полацкае княства. Летапісныя назвы самастойнага дзяржаўнага ўтварэння насілі Тураўская, Берасцейская і Смаленская землі. Горад жа звычайна не ўключаў у свае ўладанні іншыя дзяржавы, а меў толькі прыгарады. Самымі буйнымі княствамі на Беларусі былі Полацкае і Тураўскае ў X стагоддзі, а пазней у XIV – XV стагоддзях - Вялікае княства Літоўскае.

У дзяржаўных утварэннях да X –XIII стагоддзяў пераважалі дробныя дзяржавы – княствы, якія былі адасоблены, нават ад сваіх бліжэйшых суседзяў. Княства – гэты суверэнная, або вассальная феадальная дзяржава, дзяржаўнае ўтварэнне на чале з князем.

Гісторыя дзяржаўнасці на беларускай зямлі з’яўляецца арганічнай часткай агульнай гісторыі народа, яго культуры. Вывучэнне яе неабходна кожнаму адукаванаму беларусу дзеля

ўсваення свайго нацыянальнага светапогляду, нацыянальнай ідэалогіі, вызначэння месца беларускага народа сярод іншых народаў свету. Аднак і ў наш час адной з найбольш спрэчных тэм гісторыі Беларусі з'яўляецца праблема ўтварэння дзяржаўнасці на беларускай зямлі, г. зн. вызначэнне часу і месца ўзнікнення апошняй.

Ёсць некалькі пунктаў гледжання па дадзеным пытанні, кожны з якіх паспрабуем коратка ахарактарызаваць.

1. «Беларускі народ да перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі не меў сваёй нацыянальнай дзяржаўнасці».

Гэты пункт гледжання быў пануючым у нашай гісторыі на працягу доўгага перыяду часу, і толькі ў апошняе дзясяцігоддзе стала зразумелым, што дадзенная канцэпцыя не заслугойвае нават увагі. Тым не менш, у савецкі перыяд ва ўсіх школьных падручніках па гісторыі Беларусі іншых пунктаў гледжання проста не існавала. Нават у Канстытуцыі Беларускай ССР 1978 г. сцвярджалася, што «рабочыя і сяляне Беларусі...ўпершыню ў гісторыі здабылі сваю дзяржаўнасць, утварылі Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку».

2. «Першыя дзржаўна-тэрытарыяльныя ўтварэнні на беларускай зямлі – тэрытарыяльныя адзінкі Кіеўскай Русі, якія пасля яе распаду сталі самастойнымі княствамі».

Дадзены пункт гледжання таксама не можа быць сапраўдным, бо Полацк як дяржаўна-тэрытарыяльная адзінка быў самастойным і меў распрацаваную сістэму і структуру дзяржаўнага кіравання і права значна ранней за тое, як прынята ў гісторыі казаць пра ўтварэнне дзяржавы Кіеўская Русь.

3. «Славянскія дзяржавы існавалі яшчэ да нашай эры, гэта значыць, саюзы плямён (паляне, драўляне, дрыгавічы, радзімічы, крывічы і г. д.) і з'яўляюцца першымі дзяржаўнымі ўтварэннямі на славянскіх землях».

Дадзеная канцэпцыя мае свае станоўчыя і адмоўныя рысы. Яна грунтуецца на сутнасці паняцця дзяржавы, яе асноўных атрыбутах. Сярод беларускіх гісторыкаў дадзены пункт гледжання найбольш поўна і абгрунтавана развівае і падтрымлівае ў сваіх працах прафесар Я. А. Юхо.

4. « Раннесярэднявечныя княствы на беларускіх землях (перш за ўсё – Полацкае, Тураўскае) з'яўляюцца першымі дзяржаўнымі ўтварэннямі беларусаў».

Дадзены пункт гледжання падзяляюць большасць гісторыкаў, і ён мае найбольш грунтоўныя падставы, лічыцца праўдай, бо гістарычныя факты і крыніцы дасканала сведчаць, што першыя княствы на тэрыторыі нашай краіны мелі ўсе прыкметы і асаблівасці, характэрныя для самастойнага дзяржаўнага ўтварэння.

Адной з самых магутных і значных дзяржаў, якія існавалі на тэрыторыі Усходняй Еўропы ў IX- XIII стагоддзях, з'яўляецца Полацкае княства. Першыя пісьмовыя звесткі аб Полацку адносяцца да 862 года. Яны змешчаны ў кнізе «Аповесць мінулых гадоў» Іпацьеўскага летапісу. Дакладную дату заснавання княства трэба шукаць у V – VI стагоддзях, калі на беларускіх землях з'явіліся крывічы – палачане, якія пабудавалі горад і заснавалі княства. Яно існавала прыкладна з V-VI да XVI стагоддзя і займала тэрыторыю 40 – 50 тыс. кв. км., што значна больш, чым сучасныя Бельгія ці Нідэрланды. Полацкае княства было марской дзяржавай. Магутнасці і росквіту княства дасягнула дзякуючы ў асноўным выгаднаму размяшэнню на гандлёвым шляху «з варагаў у грэкі».

Па свайму паходжанню і дзяржаўнаму ладу на Полацкае княства былі падобныя княствы Турава-Пінскае, Кіеўскае і Наўгародскае. Агульнымі для ўсіх славянскіх княстваў былі пісьмовая царкоўнаславянская мова і хрысціянскія маральна-этычныя каштоўнасці. Але аб'ядноўчую ролю хрысціянства не трэба перабольшваць: на першым месцы было іх агульнае славянскае паходжанне.

Такім чынам, памыляюцца тыя, хто па-ранейшаму цвердзіць, што на беларускай зямлі ў сярэднявеччы не было дзяржаўнасці. І перш за ўсіх памыляецца прафесар З. Шыбека, які піша, што беларускі народ, "які стагоддзямі цярпеў нацыянальны прыгнёт, не меў суверэннай дзяржавы". Дзяржаўнасць на беларускай зямлі была, ёсць і будзе заўсёды. "У сваім мінулым, – як адзначае А.Р. Лукашэнка, – народы заўжды шукаюць тую крыніцу, якая здольна ўмацоўваць духоўныя сілы. Памяць патрэбна жывым, каб, гледзячы на веліч былога, будаваць заўтрашні дзень", квітнеючую Беларусь.